# БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЖАНОЧЫ КАСЦЮМ

**Аблажэвіч П. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – канд. філал. навук, дац. Хлусевіч І. М.

Традыцыйны беларускі жаночы касцюм – унікальная з'ява ў культуры народаў Усходняй Еўропы. У ім знайшлі адлюстраванне эстэтычныя ідэалы беларускага народа, а таксама яго лад жыцця. Беларускі нацыянальны жаночы касцюм вызначаецца выразнай своеасаблівасцю, ён, нароўні з іншымі праявамі нацыянальнай спецыфікі, садзейнічаў захаванню і ўмацаванню этнічнай самасвядомасці беларускага народа. Гарнітур жаночага і мужчынскага адзення, як і гутарковае маўленне, а таксама некаторыя антрапалагічныя паказчыкі, служыў яркім паказчыкам, па якім адрознівалі сваіх ад чужых.

«Маючы агульныя карані з рускім і ўкраінскім народнымі касцюмамі і фарміруючыся на аснове ўзаемаўплыву рускай, польскай, украінскай і літоўскай традыцый, [традыцыйны беларускі касцюм] тым не менш адрозніваецца самабытнасцю і з'яўляецца самастойнай з'явай. Акрамя гэтага, ён убіраў у сябе тэндэнцыі інтэрнацыянальнага гарадскога касцюма і такім чынам упісваўся ў агульнаеўрапейскі кантэкст» [1].

Як справядліва адзначаюць спецыялісты, «асабліва высокага ўзлёту фантазіі і майстэрства мастацтва беларускага народнага адзення дасягнула ў жаночым касцюме. Самабытнасць яго вызначае самабытнасць нацыянальнага касцюма беларусаў увогуле» [2, с. 3]. Пазнаёміўшыся ў інтэрнеце з вялікай колькасцю жаночых нацыянальных касцюмаў, можна заўважыць, што адзін з найгалоўнейшых атрыбутаў традыцыйнана беларускага жаночага строю – кашуля і спадніца (фартух) з чырвоным арнаментам. Пры вырабе кашулі асаблівую ўвагу звярталі на ўпрыгожанне чырвонай вышыўкай рукавоў, што звязана «з верай у магічную сілу чырвонага рамбічнага арнаменту, які нібыта засцерагаў рукі ад злых духаў, надаваў моц і дужасць як асноўным у працы» [2, с. 3]. Спадніцы (фартухі) былі ў клетку ці палосы і мелі чырвоны або сіне-зялёны ці серабрыста-белы колер. «Абавязковым элементам комплексу быў рознакаляровы, звычайна чырвона-зялёна-белага арнаменту, пояс – тканы, плецены ці вязаны, з кутасамі, махрамі або пампонамі» [2, с. 3]. На свята жанчыны надзявалі гарсэт, які «меў выгляд кароткай безрукаўкі, якая шчыльна абхплівала стан і рабіла фігуру зграбнай і жаноцкай» [2, с. 3].

Па жаночым строі можна было даведацца пра ўзрост і сямейнае становішча жанчыны. Дзяўчаты запляталі валасы ў косы і насілі на галаве



Репозиторий ГрГМУ

перавязкі накшталт вузкіх ручнічкоў, вянкі. Замужнія кабеты на людзях мусілі пакрываць галаву і звычайна насілі намітку – галаўны ўбор ручніковага тыпу Намітка «мноствам спосабаў павівалася вакол галавы на спецыяльным каркасе, канцы яе прыгожа драпіраваліся на спіне, а постаць жанчыны атрымлівала выключную статнасць і велічнасць» [2, с. 3].

У пэўнай мясцовасці Беларусі традыцыйны жаночы касцюм, як і мужчынскі, меў свае асаблівасці.

У адпаведнасці з гістарычнымі, геаграфічнымі, этнакультурнымі і лінгвістычнымі крытэрыямі даследчыкі вылучаюць на тэрыторыі Беларусі шэсць лакальных разнавіднасцей беларускага народнага адзення: Наддзвінне, Панямонне, Цэнтральная Беларусь, Прыдняпроўе, Заходняе Палессе, Усходняе Палессе [2, с. 3]. Так, на Гродзеншчыне, г.зн. Панямонні, спадніца і фартух былі пераважна зялёнага і валошкавага колераў.

Такім чынам, беларускі традыцыйны жаночы касцюм валодае яркай нацыянальнай спецыфікай, якая праяўляецца ў пэўным наборы прадметаў гарнітура жаночага адзення, спалучэнні колераў, выкарыстаным арнаменце. Беларускі традыцыйны жаночы касцюм не толькі выконваў сваю асноўную функцыю (служыў адзеннем), але і быў сродкам адрознення сваіх ад чужых, паказчыкам узросту і сямейнага статусу жанчыны, абаронай ад злых духаў. У розных мясцовасцях Беларусі традыцыйны жаночы касцюм меў свае адметнасці.


Літаратура:

1. Химдиат, Н. А. Преемственность традиций народного искусства в проектировании современной женской одежды : дис. ... магистр. тех. наук : 50.01.02 / Н. А. Химдиат ; ВГТУ. – М., 2019. – 188 с.
2. Раманюк, М. Ф. Беларускае народнае адзенне / М. Ф. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981.


Репозиторий ГрГМУ

## МАНУМЕНТ У ГОНАР САВЕЦКАЙ МАЦІ-ПАТРЫЁТКІ КУПРЫЯНАВАЙ У ЖОДЗІНА


**Бародзіч Х. А.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.


Мэтай дадзенай працы з’яўляецца захаванне памяці аб загінуўшых земляках у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Манумент маці-патрыёткі Купрыянавай – гэта з самых значных і велічных помнікаў у горадзе Жодзіна [1; 2]. Помнік быў адкрыты 29 жніўня 1975 года.